Штомесячны бюлетэнь УА «Сярэдняя агульнаадукацыйная школа № 45 г. Віцебска»

# Прадслава

*Кастрычнік, 2009*

*Цэтлікі нумара*

БелАЮ гісторыя
Корчак навіны фотазагадка
моладзь Кузя школа

## *Шаноўныя чытачы!*

*Вы трымаеце не звычайны нумар выдання «Прадслава», а спецыяльны выпуск, у большасці прысвечаны аднайменнаму клубу ЮНЕСКА. Як ведама, ён не адзін год працуе ў нашай школе. Зразумела, што і раней вы сустракаліся на старонках бюлетэня з матэрыяламі аб «прадславаўцах». Кастрычніцкі нумар прысвечаны ім, бо неўзабаве беларуская сетка клубаў UNESCO — БелАЮ — будзе адзначаць дваццацігадовы юбілей сваёй дзейнасці.*




# Жанчына ўпершыню ўзначаліла UNESCO

Балгарка Ірына Бокава выбрана на пасаду кіраўнічкі ЮНЕСКА. Упершыню ў гісторыі гэтай структуры Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў пасаду генеральнага дырэктара заняла жанчына. Кандыдатуру 55-гадовай балгаркі падтрымала выканаўчая рада UNESCO.

Выбар дыпламаткі Ірыны Бокавай на найвышэйшы пост у ЮНЕСКА быў дадаткова зацверджаны 15 кастрычніка на генеральнай канферэнцыі гэтай ўстановы.

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization; UNESCO), якая дзейнічае на карысць навучання, аховы навакольнага асяроддзя і свабоды слова, згуртавала 193 дзяржавы.

Штаб-кватэра гэтай структуры знаходзіцца ў Парыжы. У склад арганізацыі ўваходзіць 67 бюро і падраздзяленняў, размешчаных у розных частках свету.

***www.gender.do.am***

## Кур'ер UNESCO

United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization · Memory of the World

### Беларусь папоўніла міжнародны спіс «Памяць свету» UNESCO

Праграма ЮНЕСКА «Памяць свету» («Memory of the World») існуе з 1992 года. Яна была створаная з мэтаю ратавання, захавання і распаўсюджання дакументальнай спадчыны. Міжнародны спіс «Памяці свету» змяшчае аб'екты, якія маюць унікальнае сусветнае значэнне. Іх каля 200. Сёлета спіс папоўнілі архівы роду Радзівілаў і Нясвіжскі кнігазбор.

«Гэта супольны беларуска-літоўска-польска-фінска-расійска-ўкраінскі ўклад», — паведаміў журналістам Томаш Камароўскі з Польскага камітэта па пытаннях UNESCO.

Старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч заначыў, што заяўка невыпадкова была зроблена сумеснымі сіламі стольких краін: «Гэта кладзецца ў рэчышча канцэпцыі міжнароднага спісу ЮНЕСКА, паколькі там вітаюць транспамежныя праекты. Беларускі бок даўно далучаны да гэтай ініцыятывы. У нашым Нацыянальным гістарычным архіве захоўваюцца радзівілаўскія фонды, у музейных зборах знаходзіцца частка радзівілаўскага жывапісу... Мы ўвайшлі ў гэты спіс, як гаворыцца, з поўным правам, а нават са сваёй часцінкай у гэтай скарбонцы».

Дзякуючы спадчыне Радзівілаў Беларусь упершыню патрапіла ў міжнародны спіс UNESCO «Памяць свету». Гэта можа стаць добрым пачаткам, бо беларусы рыхтуюць чарговую прапанову.

***www.radyjo.net***

# Нашыя фотарэпартажы

## Клуб «Прадслава» вучыць старшакласнікаў СШ № 19

Для 11 класа сярэдняй школы каманда трэнераў «Прадслава» распавяла пра ход Другой сусветнай вайны



*Чарговая школа, незнаёмыя вучні, новы досвед*



*«Бітва за Англію» ў карцінках*



*Мы зрабілі гэтае!*

О! Конкурс! Прызы!

## Міжнародны дзень міру ў СШ № 45 пад знакам чалавека-легенды





«Чалавек-казка, чалавек-легенда». Пад такой назвай прайшлі заняткі з наведвальнікамі груп падоўжанага дня нашай школы. Вядучыя — Цімур Буйко (член клуба ЮНЕСКА) і Ніна Каўпак (куратар клуба ЮНЕСКА) — прысвяцілі свой выступ асобе выдатнага польскага педагога і пісьменніка, урача і шматгадовага дырэктара дома сірот **Януша Корчака**, які падчас Другой сусветнай вайны ахвяраваў сваім жыццём, каб хоць крыху змякчыць цярпенні сваіх выхаванцаў...





Гэтае мерапрыемства прайшло з нагоды 21 верасня, калі адзначаецца Міжнародны дзень міру і ладзяцца разнастайныя акцыі ў гонар дыялогу і ўзаемаразумення паміж народамі, супраць расавай дыскрымінацыі, дзеля захавання жыцця на планеце.





Цябе чакаюць узнагароды!

# Гістарычны конкурс

Хочаш атрымаць каштоўную ўзнагароду? Ёсць шанец для 30 чалавек! Пісьмова адкажы на гістарычныя пытанні **да 30 лістапада 2009 года** (уключна). Выражы тэст і аддай у клуб ЮНЕСКА "Прадслава".

1. *Калі пачалася Другая сусветная вайна?*
• 22 чэрвеня 1941 года. • 3 верасня 1939 года. • 1 верасня 1939 года. • 11 лістапада 1918 года. • 2 верасня 1945 года.

2. *Па якой галоўнай прычыне быў развязаны гэты глабальны канфлікт?*
• З-за г. зв. Данцыгскага калідора. • З-за Беларусі і Украіны. • З-за Судэцкай вобласці. • З-за Эльзаса і Латарынгіі. • З-за Клайпедскага (Мемельскага) краю.

3. *Якія дзве краіны першымі падвергліся нямецкаму нападу?*
• СССР і Літва. • Польшча і Вольны горад Данцыг. • Беларусь і Украіна. • Польшча і Францыя. • Вялікабрытанія і Францыя.

4. *Хто дапамог Германіі захапіць Польшчу?*
• Венгрыя і Вялікабрытанія. • Латвія і Францыя. • Румынія і Італія. • СССР і Літва. • СССР і Славакія.

5. *Якія тэрыторыі СССР адабраў у Польшчы?*
• Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. • Віленскі край і Усходнюю Украіну. • Бесарабію і Паўночную Букавіну. • Літву, Латвію і Эстонію. • Усходнюю Прусію.

6. *Як доўга супраціўляліся польскія войскі, баронячы сваю радзіму?*
• Да 3 верасня 1939 года. • Да 22 чэрвеня 1941 года. • Да 9 мая 1945 года. • Да 5 кастрычніка 1939 года. • Да 2 верасня 1945 года.

7. *Якія краіны выступілі на баку Польшчы 3 верасня 1939 года?*
• СССР і Германія. • Літва і Латвія. • Францыя і Вялікабрытанія. • Маньчжоу-го і Тану-Тувінская Народная Рэспубліка. • СССР і Славакія.

8. *Дзе гітлераўскія і сталінскія войскі правялі сумесны парад у гонар заваявання Польшчы?*
• 9 ліпеня 1941 года ў Віцебску. • 22 верасня 1939 года ў Брэсце. • 3 ліпеня 1944 года ў Менску. • 17 студзеня 1945 года ў Варшаве. • 2 мая 1945 года ў Берліне.

9. *На мяжы якіх дзяржаў была "дзіўная вайна"?*
• БНР і УНР. • Лівіі і Егіпта. • Францыі і Італіі. • Францыі і Германіі. • Польшчы і Вольнага горада Данцыга.

10. *Што такое "халакост"?*
• Генацыд нацыстаў супраць яўрэяў. • Вынішчэнне цыганоў. • Масавыя забойствы камуністаў. • Барацьба з партызанскім рухам. • Масавыя налёты англа-амерыканскай авіяцыі на тэрыторыю "трэцяга рэйха".

11. *Хто такая Ірэна Сендлерава?*
• Удзельніца Славацкага нацыянальнага паўстання. • Італьянская партызанка. • Баец Нацыянальна-вызваленчай арміі Албаніі. • Удзельніца антыгітлераўскага паўстання ў Парыжы. • Польская выратоўніца малалетніх яўрэяў.

12. *Назавіце тры прыклады германскіх канцэнтрацыйных лагераў на акупаваных славянскіх тэрыторыях.*
• Асвенцым, Бухенвальд і Тэрэзін. • Равенсбрук, Дахау і Маутхаузен. • Асвенцым, Майданек і Сабібур. • Асвенцым, Бухенвальд і Равенсбрук. • Дахау, Бухенвальд і Маутхаузен.

13. *Якія блокі ўтварыліся ў ходзе вайны?*
• Антыгітлераўская кааліцыя і краіны Восі. • Ліга Нацый і антыгітлераўская кааліцыя. • Савецкі Саюз і Антанта. • НАТО і краіны Варшаўскага дагавора. • Краіны ЕС і НАТО.

14. *Назавіце дату пачатку савецка-германскай вайны.*
• 17 верасня 1939 года. • 1 верасня 1939 года. • 2 верасня 1945 года. • 9 жніўня 1945 года. • 22 чэрвеня 1941 года.

15. *Чым вядомы Тобрук у гісторыі Другой сусветнай вайны?*
• Гэта крэпасць на беразе Чорнага мора. • Гэта ўзмоцнены абарончымі пабудовамі горад на беразе Паўночнага мора. • Гэта горад-крэпасць на беразе Міжземнага мора. • Гэта ваенная база на беразе Барэнцава мора. • Гэта крэпасць на беразе Адрыятычнага мора.

16. *Бітва пад Монтэ-Касіна адбылася ў...*
• Францыі. • Люксембургу. • Італіі. • Тунісе. • Грэцыі.

17. *Што такое аперацыя "Аверлорд"?*
• Высадка саюзнікаў ў Італіі ў 1943 годзе. • Высадка саюзнікаў у Грэцыі ў 1944 годзе. • Высадка саюзнікаў у Паўднёвай Францыі ў 1944 годзе. • Высадка савецкіх войск на дацкі востраў Барнхольм у 1945 годзе. • Высадка саюзнікаў ў Паўночнай Францыі ў 1944 годзе.

*Працяг з іншага боку*

# Кур'ер UNESCO

## Наша краіна стала членам Выканаўчай рады ЮНЕСКА

Беларусь выбрана членам Выканаўчай рады (ВР) ЮНЕСКА. Гэта кіруючы орган арганізацыі, які ў перыяд паміж сесіямі Генеральнай канферэнцыі прымае неабходныя рашэнні. Абнаўленне складу ВР адбылося на 35-й сесіі Генканферэнцыі UNESCO, удзел у якой прымае наша краіна.

Члены ВР выбіраюцца на чатырохгадовы тэрмін. Выканаўчая рада збіраецца два разы ў год для разгляду выканання праграмы, прынятай на Генеральнай канферэнцыі (яна праходзіць раз у два гады).

***БЕЛТА***

## UNESCO пашыраецца

У кастрычніку Фарэрскія выспы сталі членам-супрацоўнікам ЮНЕСКА. Цяпер у арганізацыі налічваецца 193 дзяржавы-члены і 7 членаў-супрацоўнікаў. Агулам UNESCO ўключае 200 краін, што з'яўляецца адным з найвышэйшых паказчыкаў для сістэмы структур ААН.

Першы еўрапейскі член-супрацоўнік ЮНЕСКО, Фарэры – гэта архіпелаг з 18 астравоў, размешчаны ў паўночнай частцы Атлантыкі на паўдарозе паміж Шатландыяй ды Ісландыяй. Іх насельніцтва складае каля 49 тысяч чалавек. З 1948 года яны з'яўляюцца аўтаномнай правінцыяй Даніі.

***www.unesco.org***

## Ямайская бягуння адзначана за адстойванне гендэрнай роўнасці ў спорце

Вядомай ямайскай бягунні на кароткія дыстанцыі Веранiцы Кэмпбел-Браун, што заваявала пяць алімпійскіх медалёў, афіцыйна прысвоена званне "Спартсменка ЮНЕСКА за мір" на цырымоніі ў штаб-кватэры гэтай міжнароднай арганізацыі.

***www.gender.do.am***

## Весткі клубаў ЮНЕСКА

• Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларуская Асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА» збірае і рыхтуе прадстаўнікоў моладзі ва ўзросце ад 18 да 29 гадоў з Беларусі, каб яны змаглі ўзяць удзел у праекце Еўрапейскай валанцёрскай праграмы EVS у Італіі ў моладзевай недзяржаўнай арганізацыі «Linkyouth».

• Юбілейны X Міжнародны восеньскі фестываль клубаў UNESCO пройдзе 30 кастрычніка — 1 лістапада ў Гародні.

• БелАЮ ладзіць конкурс дзіцячага малюнка «Страчаную спадчыну адновім на карцінах» для ўдзельнікаў ва ўзросце ад 11 да 18 гадоў.

• У сярэдзіне снежня Беларуская Асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА правядзе з нагоды свайго 20-годдзя юбілейны рэспубліканскі фестываль, у межах якога адбудуцца кірмаш клубаў, урачысты сход і канцэрт.

***Падборку падрыхтаваў Юрый Сцяпанаў***

Цябе чакаюць узнагароды!

# Гістарычны конкурс

*Пачатак з іншага боку*

*18. Калі і кім быў узяты Берлін?*

• Савецкімі і польскімі войскамі 9 мая 1945 года. • Савецкімі і польскімі войскамі 2 мая 1945 года. • Савецкімі войскамі 2 мая 1945 года. • Польскімі войскамі 2 мая 1945 года. • Савецкімі і амерыканскімі войскамі 9 мая 1945 года.

*19. Калі завяршылася вайна ў Еўропе?*

• 2 мая 1945 года. • 2 верасня 1945 года. • 3 ліпеня 1944 года. • 9 мая 1945 года. • 9 жніўня 1945 года.

*20. Хто развязаў баявыя дзеянні ва Усходняй Азіі і Акіяніі?*

• Японія. • ЗША. • СССР. •Тану-Тувінская Народная Рэспубліка. • Аўстралія.

*21. На каго напала Японія 7 снежня 1941 года?*

• На СССР. • На Кітай. • На Маньчжоу-го. • На Тайланд. • На ЗША.

*22. Якія страты панёс Кітай у вайне з Японіяй?*

• Ён не ўдзельнічаў у вайне. • Мінімум 10 мільёнаў чалавек. • 27 мільёнаў чалавек. • 6 мільёнаў. • 30 мільёнаў.

*23. Хто і калі скінуў атамныя бомбы на японскія гарады Хірасіма і Нагасакі?*

• ЗША 6 і 9 жніўня 1945 года адпаведна. • ЗША 2 і 9 мая 1945 года адпаведна. • Кітай 6 і 9 жніўня 1945 года адпаведна. • Аўстралія 6 і 9 жніўня 1945 года адпаведна. • СССР 9 жніўня і 2 верасня 1945 года адпаведна.

*24. Калі СССР пачаў вайну з Японіяй?*

• 9 мая 1945 года. • 22 чэрвеня 1941 года. • 17 верасня 1939 года. • 9 жніўня 1945 года. • 2 верасня 1945 года.

*25. Калі і чым завяршылася Другая сусветная вайна?*

• Падпісаннем капітуляцыі Японіі 2 верасня 1945 года. • Падпісаннем капітуляцыі Італіі 3 кастрычніка 1943 года. • Капітуляцыяй Германіі 9 мая 1945 года. • Падпісаннем капітуляцыі Бельгіі 28 мая 1940 года. • Падпісаннем капітуляцыі Фінляндыі 19 верасня 1944 года.

Імя і прозвішча ____________________

Клас і школа ____________________

Хатні адрас ____________________

Тэлефон ____________________

Узнагароды фундуюцца сайтам **www.ww2pl.info**.

## Наша фотазагадка



Творчае жыццё клуба «Прадслава» — гэта не толькі сур'ёзныя мерапрыемствы, але і хвілінкі адпачынку. Вось у адзін з такіх момантаў разняволенасці невядомы папарацы і схапіў цікавае фотаімгненне. А што адлюстравана на гэтым здымку? Падумайце і адкажыце. Найлепшая версія будзе ўзнагароджаная цікавым падарункам. Вашы пісьмовыя адказы, калі ласка, заносьце да 30 лістапада 2009 года (уключна) ў клуб «Прадслава» ў віцебскай сярэдняй школе № 45.

Хатнія ўлюбёнцы

# Кузя

Некалькі гадоў таму ў нашай сям'і адбыўся цікавы выпадак: неяк мы гулялі па вуліцы і каля крамы ўбачылі сабачку карлікавай пароды. Ён быў вельмі маленькі і выглядаў галодным і няшчасным. Нядоўга думаючы, мы ўзялі яго да сябе і далі мянушку Кузя.

Спачатку ён усіх цураўся, асабліва мяне: баяўся, відаць, што я яго заціскаю да смерці. Але пазней Кузя стаў да ўсіх прывыкаць і абраў для сябе фаварыта – тату, і нікога да яго не падпускаў у радыусе трох метраў. Перакрочыш гэтую нябачную мяжу – і на цябе абрушыцца страшэнны лай. Праз тыдзень ён паслабіў свае пазіцыі, і мне нават пашчасціла яго пару раз пагладзіць, хоць я і баялася, што Кузя нечакана можа схапіць за руку. Але, незважаючы на гэта, мы ўсё роўна яго любілі, бо ён быў такім міленькім.

Жыў Кузя у нас некалькі месяцаў, пакуль аднойчы мы не прачыталі аб'яву пра зніклага сабаку, апісанне якога падыходзіла да Кузі. Патэлефанаваўшы і дамовіўшыся аб сустрэчы, тата вярнуў яго законным гаспадарам. Зразумела, я сумавала па Кузі. І, вядома, я яго ніколі не забуду.

***Вікторыя Шаўцова***

Прадслава
Выданне СШ № 45 г. Віцебска
Наклад: 100 асобнікаў.
Галоўны рэдактар: *Ніна Каўпак.*
Намеснік галоўнага рэдактара: *Цімур Буйко.*
Адказны за выпуск: *Юрый Сцяпанаў.*